# Ідзеце на выстаўку!

*(Кніжная выстаўка да Ўсебела-рускага Зьезду Саветаў пры Дзярж. Унівэр. бібліятэцы).*

Побач з агульнай Усебеларускай выстаўкай Беларуская Дзяржаўная Універсытэцкая бібліятэка паладзіла ў сваім будынку (б. Юбілейны м) багатую выстаўку старасьвецкіх і новых кніг.

Трэба зазначыць, што Дзярж. Унів. бібліятэка іствуе ўсяго другі . Пры вельмі цяжкіх варунках варылася наша бібліятэка. Патрэб было вялікае замілаваньне да гэй справы, каб у працягу аднаго ду сабраць бібліятэку ў 100.000 кніг. Усё гэта стварылася дзякуючы вецкай уладзе, якая не шкадавала кіх грашовых сродкаў на будаўва нашай культуры і дзякуючы аўніку бібліятэкі, тав. Сіманоўскаму, які бязьмежна і бяскарысна любіць гэту справу.

Т. Сімаиоўскі разьяжджаў па ўсёй Расеі, закупліваў бібліятэкі вучоных (як напр. бібл. Янчука, Жывапісцава, Карскага і г. д.), падабраў падхадзячы штат служачых, кіраваў рамонтам дому і г. д.

Бібліятэка мае цяпер 2000 падпісчыкаў. Чытальня штодня перапоўнена (ад 300 да 400 чалавек студэнтаў і інш. моладзі). На другім паверсе ёсьць багаты аддзел для прафэсуры і іншых працаўнікоў навукі. Словам, бібліятэка зьяўляецца цяпер гордасьцю нашай культуры.

Выстаўка пры бібліятэцы (на ця-

першні час досыць багатая. Пачвём ие агляд з Беларускага аддзелу.

## Беларускі аддзел.

Адразу кідаецца ў вочы старадаўныя скураныя фаліянты, сталёвы друк мінулых вякоў, арыгінальныя прыгожыя вінеткі і г. д.

Красуецца «Літоўскі Статут», выданьне 2, 1619 г.

2 экзэмпляры хронікі Стрыйкоўскага, выд у канцы 16 веку.

Выданьне Канстанціна Астрожскага, 1594 г.

Выданьні нашых вольных друкарняў у Менску, Магілеве, Слоніму, Смаленску, Горадні і г д. Канец 18 і пач 19 веку

Уніяцкія выданьні ў нашым краі. Пач. 18 веку.

Выданьні нашых пісьменьнікаў: Марцінкевіча, Чэчата, Баршчэўскага і іншых.

„Сборник статей, недозволенных цензурой“, 1862 г. Паміж іншым ёсьць у зборніку цікавы артыкул пад назваю «Из Белоруссии. То что есть, хотя и не то, что кажется друзьям московским». Аўтар невядомы.

«Отчет графа М. Н. Муравьева по управлении Сев.-Зап. Краем». 31 мая 1863 г. па 17 красавіка 1865 г.

«Докладная записка о мерах, могущих укрепить национальное самосознание белоруссов и противодействовавших их полонизации». Сакрэтна. Менскі губэрнатар Гірс, 1914 г. Пры гэтым трэба адзначыць, што губэрнатар Гірс быў адным з заядлых прыхільнікаў беларускага адраджэньня. У 1914 годзе не дазваляў заложыць у Менску беларускі клюб і беларускую аматарскую трупу.

Дзьве Ўказных Кнігі Беларускага Гэнэрал-Губэрнатарства з часоў Кацярыны і Паўла.

Ёсьць пры беларускім аддзеле багатая калекцыя беларускіх газэт і часопісаў ад 1905 г. да апошняга часу.

Але самае цікавае і карыснае—гэта багаты збор кніг па беларусазнаўству на розных мовах. Паміж імі ёсьць шмат кніг з аўтографамі вучоных.

Беларускія вучаныя і літэратары цяпер карыстаюцца гэтымі кнігамі.

## Аддзел навейшай літэратуры.

У гэтым аддзеле сабраны камплект усіх выданьняў за 1922 г. Расейскай Цэнтр. Кніжнай Палаты Украінскай Кн. Палаты.

## Грамадзянскі друк 18 в.

Паміж гэтымі кнігамі ёсьць першае выданьне Ламаносава, выд. Пятроўскай эпохі.

„Бархатная кніга“ Новікава з аўтографам.

## Заграчічны вольны расейскі друк.

Лёнданскае выд. Гэрцана. Выд. фонду рэсейскага друку ў Лёндане, Бэрліве, Жэневе і г. д.

## Аддзел заграцічны.

Аддзел заграцічнай навейшай літаратуры мае новыя выданьні: амэрыканскія, нямецкія, ангельскія і інш.

Ёсьць спэцыяльныя пасылкі кніг 1922 г. з бібліятэкі Бэрлінскага Ўніверсытэту.

«Трактар» (сельска-гасп. маш. 2 томы. Выд. міжнароднае, друкаваліся ў Нью-Ёрку ў 1921-1922 г.

## Часопісі Р. С. Ф. С. Р.

Сабраны ўсе газэты Р.С.Ф.С.Р. на ўсіх мовах.

## Інкунабулы.

Кніжкі, друкаваныя да 1520 г. у Кельне, Базэлі, Вэнэцыі і інш. у большасьці на лацінскай мове.

Творы Лактанцыя ў выданьні Альдова ў Вэнэцыі.

3 кніг 16 веку. Базэльскія выданьні Фробэна, Эразма, Ротэрдамскага, Ёсіфа Флавія, старасьвецкая польская біблія і г. д.

3 кніг 17 веку. 52 экзэмпляры выд. Эльзэвіраў.

Цэлы камплект кніг з эпохі францускай рэвалюцыі.

Папскі індэкс забароненых кніг. Першае выд. Вольтэра.

## Аддзел славяна-рускага друку.

Кіеўскія выданьні 1620 г. „Номаканон“ вядомая ў Расеі ў 4 экз. (чацьвёрты экз. у нашай бібліятэцы.)

Лексікон славяна-рускі.

Жэзл Праўленьня Аляксея Міхайлавіча.

## Старасьвецкія рукапісы.

Паміж рукапіснымі кнігамі ёсьць надта пекна ільлюстраваныя, з багатымі арнамэнтамі і ў багатых яркіх фарбах, як напр., кніга «Меч духоўны», (18 век).

## Выданьні Акадэміі навук.

Бібліятэка мае поўны камплект гатых кніг, да 3000 томаў.

## Росіка.

Заграцічныя кнігі аб Расеі.

## Аддзел жыдоўскіх кніг.

Гэты аддзел досыць багаты і вызначаецца тым, што ў ім прадстаўлены толькі тыя кнігі, якія друкаваліся на Беларусі з мінулых вякоў. Кнігі гэтыя складаюць багаты матар'ял па гісторыі разьвіцьця жыдоўскай культуры на Беларусі. Аб гэтым мы падаём спэцыяльны артыкул жыдоўскага вучонага М. Рабіновіча.

Тав. Сіманоўскі абводзіў мяне па ўсіх аддзелах, паказваў найцікавейшыя кнігі, апавядаў гісторыю стварэньня бібліятэкі—аднэй з найлепшых скарбніц нашай культуры.

— А з дэлегатаў шмат хто прыходзіў на Вашу выстаўку?—запытаўся я.

— Ня надта...

— Нічога. Былі вельмі заняты на Зьезьдзе. Рабочыя і сяляне вельмі цэняць культуру, але да Акцябра яны ня мелі доступу ў гэты вялікі храм, а пасьля Акцябра яны аддалі ў навуку свае найлепшыя маладыя сілы.

*З. Бядуля.*